# НОВЫЯ ФОРМЫ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПРАЕКТА «НА ХВАЛІ ЧАСУ, У ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ» ВА ЎМОВАХ ПАНДЭМІІ COVID-19

***Т. А. Лаўрык,***
*аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*загадчык інфармацыйна-аналітычнага аддзела*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

У 2020 г. ва ўмовах пандэміі COVID-19 бібліятэкі сустрэліся з неабходнасцю пошуку і рэалізацыі новых формаў працы. З красавіка вялікая колькасць бібліятэк на тэрыторыі Беларусі была зачынена для наведнікаў. Аднак бібліятэчныя работнікі працягвалі працаваць, падтрымліваючы сувязь са сваімі карыстальнікамі.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі некаторыя традыцыйныя інфармацыйна-бібліяграфічныя паслугі рэалізоўваліся ў анлайн-рэжыме, працягвалася выставачная і праектная дзейнасць. Аддзел галерэйна-выставачнай дзейнасці, які ажыццяўляе арганізацыю кніжных выставак, распачаў працу над іх падрыхтоўкай у віртуальным выглядзе з мэтай азнаямлення аддаленага карыстальніка.

З 2019 г. дзейнічае сумесны праект «На хвалі часу, у плыні жыцця», які рэалізуецца чатырма арганізацыямі: Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Выдавецкім Домам «Звязда» (у прыватнасці, часопісам «Маладосць»). Мэтай праекта стала падрыхтоўка да маштабнага святкавання – 100-годдзя літаратурнага аб’яднання «Маладняк», першага прафесійнага згуртавання пісьменнікаў Беларусі, якое было створана 28 лістапада 1923 г. Дзякуючы супольным намаганням пачалася праца над віртуальным праектам «На хвалі часу, у плыні жыцця», які стварае Нацыянальная бібліятэка Беларусі на сваім партале і дзе знаходзяць месца паўнатэкставыя дакументы з фонду бібліятэкі і партнёраў. Пачаць праектную дзейнасць стала магчымым пры падтрымцы музея гісторыі беларускай літаратуры. Пасля выхаду кнігі «Расстраляная літаратура» (2008) у серыі «Беларускі кнігазбор» на працягу ўжо 10 гадоў тут рэалізоўваўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праект «Залатая раніца беларускага Адраджэння», прысвечаны літаратурнай дзейнасці пісьменнікаў міжваеннага перыяду. Такі доўгі тэрмін яго ажыццяўлення прыпыніўся, а падтрымка і зварот да супольных дзеянняў у межах праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» даў штуршок зноў разгарнуць доўгатэрміновую дзейнасць, зацікавіць гэтай працай шырокую грамадскасць.

У 2019–2020 гг. выкарыстоўваліся наступныя *формы папулярызацыі*.

1. Публікацыя навукова-папулярных артыкулаў у перыядычным друку. У часопісе «Маладосць» пад рубрыкай праекта выходзілі артыкулы пра юбілеі пісьменнікаў-маладнякоўцаў, інфармацыя пра мерапрыемствы адлюстроўвалася і на старонках газет «Звязда», «ЛіМ», «Наша слова», «СБ: Беларусь сегодня», у «Краязнаўчай газеце».

2. Размяшчэнне навін на сайтах удзельнікаў праекта. Інфармацыю пра дзейнасць праекта рыхтавалі Нацыянальная бібліятэка, часопіс «Маладосць» і музей гісторыі беларускай літаратуры. Яна адлюстроўвалася на сайтах партнёраў і ў сацыяльных сетках.

3. Правядзенне вечарын, імпрэз, адкрытых лекцый, прысвечаных юбілеям пісьменнікаў [3, с. 347]. У пачатку другога года супольнай дзейнасці адбыўся круглы стол «Маладнякоўскімі крокамі», на якім падвялі вынікі зробленага і абмеркавалі планы надалей. Прагучалі даклады, прысвечаныя дзейнасці пісьменніцкага згуртавання і спадчыне «маладнякоўцаў». Шырокі рэзананс у СМІ выклікалі мерапрыемствы да Дня літаб’яднання «Маладняк», якія ўключалі ўрачыстую імпрэзу і адкрыццё выстаўкі ў музеі кнігі НББ. Выстаўка з падобнай назвай аб’яднала ўпершыню на адной пляцоўцы дакументы трох арганізацый – Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва [5].

У красавіку 2020 г. сітуацыя змянілася. Нягледзячы на тое што Нацыянальная бібліятэка Беларусі і арганізацыі-партнёры з-за пандэміі спынілі абслугоўванне карыстальнікаў, праект працягваў дзейнічаць. Паўставалі складанасці з кантактаваннем паміж партнёрамі і абменам матэрыяламі. Аднак шырокая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць па рэалізацыі праекта не магла заглухнуць: цяпер неабходна было шукаць новыя шляхі яго прасоўвання. Яны павінны былі падтрымліваць рэзананс у інтэрнэт-прасторы. Неабходна было, каб новыя раздзелы, прысвечаныя Кузьму Чорнаму і Уладзіміру Дубоўку, прагучалі не менш выразна, чым створаныя ў 2019 – пачатку 2020 г. да юбілеяў В. Маракова (1909–1937), А. Бабарэкі (1899–1938), У. Хадыкі (1905–1940) [1; 2; 4].

У пачатку 2020 г. пачалася вельмі сур'ёзная праца над даследаваннем творчасці Уладзіміра Дубоўкі (1900 (ці 1901) – 1976) – беларускага паэта, мовазнаўца. Удзельнікі праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» далучыліся да абмеркавання, якое разгарнулася ў навуковых колах з нагоды вызначэння года нараджэння гэтай асобы, бо ў 2019 г. выяўлена метрыка, у якой быў адзначаны 1901 г. як год нараджэння паэта. Да стварэння галоўнага падраздзела, прысвечанага жыццёваму і творчаму шляху У. Дубоўкі, далучылася вядомая даследчыца, беларуская паэтка, кандыдат філалагічных навук Ірына Эрнстаўна Багдановіч. Разгарнуць папулярызацыю раздзела ва ўмовах пандэміі спосабамі, як раней, не атрымлівалася. Аднак:

– быў распрацаваны цыкл навін пра найбольш яркія старонкі праекта, які рыхтуецца па меры з'яўлення цікавай інфармацыі: пра ўдзел даследчыкаў, дапамогу ў рэалізацыі праекта іншых арганізацый, акрамя партнёраў, размяшчэнне ў межах кантэнту рэдкіх дакументаў і кніг;

– падрыхтаваныя відэапрэзентацыі знаёмілі з раздзеламі, прысвечанымі юбілеям Кузьмы Чорнага і Уладзіміра Дубоўкі, якія адзначаліся летам.

Да юбілею Кузьмы Чорнага была запісана відэапрэзентацыя, зробленая вядучым бібліёграфам інфармацыйна-аналітычнага аддзела Юліяй Амосавай. Відэа размясцілі на партале Нацыянальнай бібліятэкі і на канале YouTube.com, прэзентавалася яна і ў сацыяльных сетках, перададзена для размяшчэння на сайтах партнёраў супольнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця». Відэапрэзентацыя будзе ўключана ў віртуальны раздзел з мэтай дыстанцыйнага знаёмства з матэрыяламі праекта. Да юбілею Уладзіміра Дубоўкі таксама была падрыхтавана прэзентацыя, якая трансліравалася ў суправаджэнні песні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«О, Беларусь, мая шыпшына» (музыка М. Куліковіча, словы У. Дубоўкі, выконвае Данчык). У адрозненне ад відэапрэзентацыі да юбілею Кузьмы Чорнага, якую праводзіла супрацоўніца бібліятэкі, тут фактычна быў пададзены відэаўрок па карыстанні паўнатэкставымі дакументамі. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запісаў відэалекцыю да 115-годдзя Пятра Глебкі пра мемарыяльны кабінет паэта, яго асабістую бібліятэку, якая захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

3. Створана рубрыка «Да 100-годдзя літаб'яднання "Маладняк"» на партале НББ, у якой сабрана інфармацыя пра мерапрыемствы супольнага праекта. На беларускамоўнай версіі сайта бібліятэкі захоўваецца больш навін пра ходу праектнай дзейнасці, таму прапаноўваецца найперш знаёміцца з беларускамоўным сайтам. У англамоўнай версіі ў раздзеле навін таксама ёсць рубрыка «To the 100th Anniversary of "Maladnyak"», у якой размешчана інфармацыя пра найбольш важныя падзеі, якія адбыліся ў межах праекта. Гэта дае падставу неўзабаве пачаць працу па стварэнні кароткай версіі праекта на англійскай мове.

4. Распрацаваны анлайн-конкурс чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», які пачне працу 1 кастрычніка. Яго мэта – падтрымка супольнай дзейнасці праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» і ўвага да раздзела, прысвечанага 120-годдзю Уладзіміра Дубоўкі, якога Янка Купала называў «беларускі Пушкін». Да ўдзелу запрашаюцца не толькі школьнікі і моладзь, але і дарослыя, якіх цікавіць творчасць выдатнага беларускага паэта. Конкурс арганізуецца пры інфармацыйнай падтрымцы часопісаў «Маладосць» і «Бярозка». У журы запрошаны спецыялісты – удзельнікі праекта (выкладчыкі, паэты, артысты, настаўнікі): яны і вызначаць пераможцаў конкурсу па розных катэгорыях.

Супольны праект «На хвалі часу, у плыні жыцця» працуе другі год і ўпэўнена набірае сілу дзеля пошуку новых формаў падачы матэрыялу, далучэння новых даследчыкаў, розных спосабаў азнаямлення з ім шырокай грамадскасці.

---

1. *Лаўрык, Т.* «Маладнякоўскі» Бялінскі : да 120-годдзя Адама Антонавіча Бабарэкі / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2019. – № 8. – С. 34–39.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Лаўрык, Т.* «Мужна жыў і мужна паміраў» : да 110-годдзя Валерыя Маракова / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2019. – № 3. – С. 114–117.

3. *Лаўрык, Т. А.* Формы папулярызацыі віртуальных праектаў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (на прыкладзе праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» : да 100-годдзя Усебеларускага літаратурнага аб'яднання «Маладняк») / Т. А. Лаўрык // Матэрыялы XV Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў (г. Мінск, 4–5 крас. 2019 г.) / НББ ; [склад. Т. А. Сапега, А. А. Суша, К. В. Суша]. – Мінск, 2019. – С. 344–347.

4. *Лаўрык, Т.* «Я пакінуў у дарозе многа…» : да 115-годдзя Уладзіміра Марцінавіча Хадыкі / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2020. – № 1. – С. 59–62.

5. «Маладнякоўскімі крокамі» : выстава пад такой назвай адкрылася 16 студзеня 2020 г. у музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 1. – С. 31–32.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РОЛЬ ГОСУДАРСТВЕННОГО КАТАЛОГА МУЗЕЙНОГО ФОНДА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ОТЕЧЕСТВЕННОМ МУЗЕЙНОМ ДЕЛЕ

***А. А. Лесин,***
*соискатель ученой степени кандидата наук*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств,*
*ведущий научный сотрудник Национального исторического музея*
*Республики Беларусь*

В Республике Беларусь уделяется большое внимание развитию сферы культуры – в частности системы государственных музеев. Развитие музейного дела на современном этапе подразумевает, помимо прочего, использование передовых технологий и внедрение передовых методов работы, активную инновационную деятельность. Это подразумевает активное внедрение информационных технологий в музейное дело, включая и такую сферу, как музейный фондовый учет.

Масштабным проектом государственного значения является в нашей стране развитие Государственного каталога Музейного фонда Республики Беларусь (далее – ГКМФ) – официальной системы электронного учета музейных фондов. Ведение учета в системе ГКМФ предусмотрено Кодексом Республики Беларусь о культуре. Согласно статье 177 Кодекса: